Лугаўцова, С.Л. "Молім праявіць міласэрнасць…": лёс сяброў Дэмакратычнага таварыства Пінскага павета ў 1840-я гг. / С.Л. Лугаўцова // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. Вып. 9 / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн.: БДУ, 2014. – с. 61 – 72.

**С. Л. ЛУГАЎЦОВА**

# «МОЛІМ ПРАЯВІЦЬ МІЛАСЭРНАСЦЬ...»: ЛЁС СЯБРОЎ ДЭМАКРАТЫЧНАГА ТАВАРЫСТВА ПІНСКАГА ПАВЕТА Ў 1840-я гг.

Артыкул прысвечаны лёсу ўдзельнікаў Пінскага дэмакратычнага таварыства (1836—1838 гг.), што ўваходзіла ў склад «Садружнасці польскага народа» (1835—1839 гг.) і было арганізавана Ш. Канарскім. На падставе аналізу шырокага кола архіўных крыніц аўтар высвятляе, якія прысуды былі вынесены ўдзельнікам таварыства, як у 1840-я гг. склаўся лёс А. Ажэшкі, Ф. Цярлецкага, Э. і В. Горнічаў, Б. Адамовіча, Ю. Кужанецкага, Л. Корсака, І. Краскоўскага, К. Шалевіча.

The article is devoted to the fate of participants of the Pinsk democratic society (1836—1838) that was a part of the «Polish people's concord» (1835—1839) organized by Shymon Konarski at the territory of the former Polish state. Based on analysis of a wide range of archive sources the author finds out what sentences were passed on the members of the secret society; observes the destinies of A. Ajeshko, F. Tsarletsky, E. and V. Hornich, B. Adamovich, Y. Kujanetsky, L. Corsak, I. Kraskovsky, K. Shalevich in 1840-th years.

*Ключавыя словы*: садружнасць польскага народа, шляхціцы, прысуд, прашэнне, чыноўнік.

*Keywords*: Polish people's concord, the nobles, the sentence, the petition, the clerk.

Артыкул з'яўляецца працягам цыкла публікацый, прысвечаных тайнай арганізацыі «Садружнасць польскага народа», створанай Ш. Канарскім на тэрыторыі Літвы, Беларусі і Украіны. Шымон Канарскі адносіўся да тых шляхецкіх рэвалюцыянераў, якія балюча перажывалі паражэнне паўстання 1830—1831 гг., шукалі шляхі барацьбы з расійскім самадзяржаўем паводле новых дэмакратычных падыходаў. Гэтыя падыходы ўключалі неабходнасць удзелу ў барацьбе сялян разам са шляхтай,

**Лугаўцова Святлана Леанідаўна** — дацэнт кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук.

ліквідацыю феадальных перажыткаў, а таксама сумесную барацьбу ўсіх народаў Рэчы Паспалітай за яе аднаўленне. Таемна пракраўшыся праз мяжу Расійскай імперыі ў канцы 1835 г., Канарскі здолеў стварыць на яе тэрыторыі сетку таварystваў, якія былі заснаваны на новых дэмакратычных прынцыпах. Адной з такіх арганізацый стала Пінскае дэмакратычнае таварыства (1836—1838 гг.), дзейнасць якога разглядалася ў асобнай публікацыі [12].

Дадзены артыкул падрыхтаваны па матэрыялах Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва ў Вільні і прысвечаны лёсу ўдзельнікаў таемнага таварыства ў Пінскім павеце ў 1840-я гг. Аўтар абапіралася на дакументы фондаў 378 і 1269. Фонд 378 змяшчае матэрыялы канцылярыі Віленскага, Ковенскага, Гродзенскага генерал-губернатара. Ён мае агульны і палітычны аддзелы. Апошні раскрывае шырокае кола пытанняў, якія расійская адміністрацыя ў Паўночна-Заходнім краі лічыла палітычнымі: ад выдачы жыхарам замежных пашпартоў да ўстанаўлення сакрэтнага нагляду паліцыі за нядобранадзейнымі асобамі. Матэрыялы палітычнага аддзела згрупаваныя ў першую чаргу ў храналагічным парадку, па гадах. Аднак у складзе фонду зрэдку прысутнічае класіфікацыя і па вопісах. Вопіс № 216 уключае справы аб удзельніках антыўрадавых арганізацый і змоў. У прыватнасці, аўтарам была разгледжана пяцітомная справа (больш за 1600 аркушаў) «аб асобах, высланых з тутэйшага краю на пасяленне ў розныя губерні» [1–5]. Справа ўтрымлівае прысуды, у адпаведнасці з якімі асобы былі высланы, звароты ссыльных і іх сваякоў наконт паляпшэння іх становішча і магчымасці вяртання на радзіму, пастановы службовых асоб рознага ўзроўню (ад губернатараў да імператара) з абгрунтаваннем прычын прынятых рашэнняў. Фонд 1269 змяшчае матэрыялы Віленскіх следчых камісій, якія разглядалі справы ўдзельнікаў антыўрадавых арганізацый. Вопіс першы названага фонду ўключае справы камісіі, створанай паводле распараджэння Віленскага ваеннага губернатара М. А. Даўгарукага ад 30 мая 1838 г. пад старшынствам віцэ-губернатара А. І. Трубяцкога з мэтай расследавання дзейнасці «Садружнасці польскага народа» на тэрыторыі Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў. У склад камісіі таксама ўвайшлі віленскі губернскі пракурор надворны саветнік Дубецкі, засядацель віленскай крымінальнай палаты калежскі асэсар Андэрсан, капітан корпуса жандараў Арандарэнка [7, л. 15–15 адв.]. Прысуды ўдзельнікам Пінскага дэмакратычнага таварыства былі зацверджаны ваенным судом у лютым — сакавіку 1839 г. Пацяпленне ў адносінах да ўдзельнікаў «змовы Канарскага» ў Расійскай імперыі наступіла вясной 1841 г., калі былі зроблены першыя

крокі па паляпшэнні іх становішча. 5 сакавіка 1841 г.[1] Галоўны начальнік Трэцяга аддзялення Уласнай Яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі (далей — Трэцяе аддзяленне) і шэф жандараў А. Х. Бенкендорф паведаміў Віленскаму ваеннаму губернатару Ф. Я. Міркавічу рашэнне імператара адносна звароту Кіеўскага ваеннага губернатара Д. Г. Бібікава. Апошні цікавіўся магчымасцю хадайнічаць аб паляпшэнні становішча палітычных злачынцаў, сасланых з даручанага яму краю ў Сібір, з нагоды прызначанага на 16 красавіка 1841 г. шлюбу спадкаемцы расійскага прастола вялікага князя Аляксандра Мікалаевіча з прынцэсай Гесэн-Дармштадскай і Рэйнскай Марыяй Аляксандраўнай. На зварот Бібікава была атрымана найвышэйшая згода [1, арк. 13].

У адказ на ліст А. Х. Бенкендорфа 1 красавіка 1841 г. Ф. Я. Міркавіч звярнуўся да вайсковага міністра А. І. Чарнышова з хадайніцтвам наконт змякчэння прысудаў шэрагу асоб, якія праходзілі па «справе Канарскага». Зварот менавіта да вайсковага міністра не быў выпадковым. Прысуды ўдзельнікам «Садружнасці» былі вынесены ваенным судом, і, адпаведна, справы палітычных злачынцаў захоўваліся ў ваенным ведамстве. Ф. Міркавіч патлумачыў прычыны свайго хадайніцтва. Ён лічыў, што Віленская следчая камісія, якая ў 1841 г. займалася расследаваннем справы аб антыўрадавай змове студэнтаў Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, зайшла ў сваёй дзейнасці ў тупік з прычыны адмовы студэнтаў супрацоўнічаць са следствам. Разам з тым, на думку Ф. Міркавіча, чыстасардэчнае прызнанне многіх «па змове эмісара Канарскага» спрыяла хуткаму развіццю следства [1, арк. 1]. 5 красавіка ў лісце да Бенкендорфа ваенны губернатар развіў сваю думку: «Унікаючы старанна ў прычыны запаволення ходу працы следчай камісіі ... пераконваюся, што яно вынікае не столькі ад амаральнасці і бессаромнасці людзей, адданых палітычным задумам, колькі і ад укаранёнага тут наогул пераканання, што свядомасць і раскаянне не выратоўваюць асобы кожнага і не пазбаўляюць іх ад адказнасці. Прасякнутыя гэтай думкай палітычныя арыштанты захоўваюць упартае маўчанне ... і ўсім перакананнем і намаганням следчых супрацьпастаўляюць самую закаранелую ўпартасць» [1, арк. 14—14 адв.]. Ф. Міркавіч прапаноўваў палепшыць становішча тых асуджаных, «якія вядомы ўраду і публіцы тутэйшай як людзі, якія выдалі ўсе таямніцы эмісара» [1, арк. 15]. У пададзены Ф. Я. Міркавічам спіс увайшлі Я. Былеўскі, Л. Орда, А. Ажэшка, І. Радзевіч, Ф. Цярлецкі,

[1] Усе даты падаюцца па так званым старым стылі, па юліянскім календары.

П. Грабоўскі, Э. Горніч, С. Казакевіч і М. Конча [1, арк. 3—12]. Трое членаў спіса — А. Ажэшка, Ф. Цярлецкі і Э. Горніч — з'яўляліся членамі Пінскага дэмакратычнага таварыства.

Антоній Ажэшка быў адным з арганізатараў таемнага таварыства ў Пінскім павеце, выконваў у ім абавязкі сакратара. Віленская следчая камісія высветліла таксама, што ў 1831 г. А. Ажэшка дапамог двум удзельнікам паўстання 1830—1831 гг. шляхціцам Гуляніцкаму і Юшкевічу ўцячы ад праследавання ўлад. У 1834 г. Антоній сустракаўся з эмісарам Н. Каперніцкім, якому перадаў 15 руб. у дапамогу польскім эмігрантам [9, арк. 21—22]. Пасля арышту Ажэшка актыўна супрацоўнічаў са следствам. На першым жа допыце ён не толькі «прынёс поўнае раскаянне», раскрыў імёны членаў таварыства, спосабы тайнай перапіскі, але і «спрыяў доказамі сваімі давядзенню да прызнання» сяброў «Садружнасці» з іншых паветаў. У 1838 г. менавіта Ажэшка выдаў уладам падпаручніка Інгерманландскага палка А. Кузьміна-Караваева, які спрабаваў арганізаваць Ш. Канарскаму ўцёкі з-за кратаў [9, арк. 22 адв.]. Па іроніі лёсу яго псеўданімам у таварыстве было імя Іуда [7, арк. 386]. А. Ажэшка быў прылічаны да другога разраду дзяржаўных злачынцаў [1], што азначала пазбаўленне дваранскіх правоў і ссылку ў Сібір на катаржныя работы. За супрацоўніцтва са следствам прысуд быў зроблены больш мяккім, яго адправілі на пасяленне [10, арк. 6 адв. — 7]. У красавіку 1841 г. Ф. Я. Міркавіч прапанаваў дазволіць А. Ажэшку вольнае пасяленне ў Сібіры [1, арк. 5 адв. — 6]. 7 мая 1841 г. прапанова была зацверджана Мікалаем I [1, арк. 57 адв.]. Антоній Ажэшка пражываў у Томскай губерні да чэрвеня 1857 г., калі атрымаў дазвол вярнуцца на радзіму ў адпаведнасці з палажэннем каранацыйнага маніфеста Аляксандра II [14, s. 437–438].

Перавод на вольнае пасяленне азначаў значнае паляпшэнне становішча ссыльнага. Аўтар «Хронікі Сібірскай» Я. Іваноўскі распавядаў, што ў 1830—40-я гг. шляхціцы былой Рэчы Паспалітай, сасланыя на катаржныя работы і пасяленне ў Сібір, складалі на яе прасторах своеасаблівую супольнасць. У іх была агульная каса, у якую кожны ўносіў 20 адсоткаў сродкаў, што былі атрыманы ад родных і блізкіх. Дзякуючы гэтай касе дапамогу атрымлівалі бедныя ссыльныя, якія не мелі падтрымкі з дому. Тыя, хто меў права вольнага пасялення, маглі самастойна выбіраць мес-

[1] Усе асуджаныя па справе былі падзелены на пяць разрадаў. Да першага быў аднесены сам Ш. Канарскі, якога расстралялі ў Вільні ў лютым 1839 г.

ца жыхарства ў Сібіры. Іх выбар спыняўся на яе найбольш абжытай заходняй частцы. У той час як ссыльныя, месца пасялення якіх вызначалі ўлады, часта траплялі ў такія цяжкадаступныя населеныя пункты, куды не прабіваўся прамень брацкай дапамогі ад землякоў, што значна ўскладняла іх існаванне [13, с. 367—370].

Перайсці на вольнае пасяленне ў Сібіры ў маі 1841 г. было дазволена таксама Францу Цярлецкаму. Ён быў адзіным сябрам Пінскага таварыства, хто паспрабаваў распаўсюдзіць новыя дэмакратычныя ідэі сярод сваіх прыгонных. Ф. Цярлецкі абяцаў сялянам спыніць цялесныя пакаранні, прапанаваў выбіраць суддзяў для справядлівага суда, чым «давёў іх да таго, што яны сталі аказваць двароваму кіраванню непаслушэнства» [9, арк. 23 адв.]. Аднак, «спазнаўшы шкодныя вынікі сваіх учынкаў», Цярлецкі стаў абыходзіцца з сялянамі па-ранейшаму. Ён здзекаваўся з прыгонных да такой ступені, што мясцовы святар павінен быў іх спавядаць перад смерцю [9, арк. 26 адв.]. Следчая камісія высветліла, што ў 1833 г. Цярлецкі сустракаўся з прадстаўнікамі польскай эміграцыі, перадаваў ім грошы, атрымліваў забароненую літаратуру. Тым не менш за актыўнае супрацоўніцтва са следствам ён быў прылічаны да 3-га разраду дзяржаўных злачынцаў, што азначала ссылку ў Сібір на пасяленне з правам перадачы яго маёнтка нашчадкам [14, арк. 7].

Маці Ф. Цярлецкага Саламея неаднаразова хадайнічала аб яго вяртанні на радзіму. У ліпені 1842 г. імператар адмовіўся падтрымаць хадайніцтва, палічыўшы, што становішча Франца было ўжо дастаткова палепшана ў 1841 г. [2, арк. 252].

У 1843 г. С. Цярлецкая зноў маліла аб вяртанні на радзіму адзінага сына, «які пяты год знемагае ў Томскай губерні» [3, арк. 212]. Томскі грамадзянскі губернатар адрапартаваў у лютым 1844 г., што Франц паводзіць сябе добра, у падазроным складзе думак не заўважаны [3, арк. 305]. Трэцяе аддзяленне паведаміла пра гэта Віленскаму ваеннаму губернатару Ф. Я. Міркавічу. Адзначым, што ў выпадку магчымага вяртання на радзіму палітычнага злачынца практыка звароту да мясцовага начальніка была абавязковай. У дадзеным выпадку Міркавіч палічыў магчымым хадайнічаць толькі аб дазволе Цярлецкаму паступіць на службу ў Томскай губерні, што і было зацверджана [4, арк. 67].

У спіс, пададзены Ф. Я. Міркавічам 1 красавіка 1841 г., увайшоў яшчэ адзін прадстаўнік Пінскага дэмакратычнага таварыства Эразм Горніч. Ён літаральна «ўскочыў у вагон адыходзячага цягніка», бо падаў прашэнне аб вяртанні на радзіму 23 сакавіка. Горніч прасіў даць яму магчымасць вярнуцца на радзіму, каб прывесці ў парадак заблытаныя справы

маёнтка пасля смерці бацькі [1, арк. 51—52]. Трэцяе аддзяленне запрасіла меркаванне Пермскага грамадзянскага губернатара. У ліпені 1841 г. прыйшоў адказ з Пярмі, у якім паведамлялася аб «добрых і сціплых паводзінах» Горніча і аб тым, што ён заслугоўвае памілавання [2, арк. 58]. Аднак станоўчы адказ імператара па гэтай справе не быў атрыманы. На погляд аўтара, гэта тлумачыцца тым, што ў справе Горніча не было прыпіскі аб супрацоўніцтве са следствам. Сапраўды, першапачаткова ён паказаў на допытах, што ведаў Канарскага як эмісара, з'яўляўся сябрам тайнага таварыства, перадаваў грошы на яго карысць. Аднак пазней адмовіўся ад сваіх паказанняў, заявіў, што яны былі «зроблены ў хваравітым стане» [10, арк. 1 адв.]. Трэба падкрэсліць, што ўдзел Эразма ў таварыстве так і не быў даказаны. У сакавіку 1839 г. яго прылічылі да 5-га разраду дзяржаўных злачынцаў і саслалі ў Пермскую губерню з вызваленнем маёнтка ад секвестра [10, арк. 2].

У ліпені 1841 г. пра лёс брата хадайнічала дваранка Б. Будзіская. Яна пісала, што па справе Ш. Канарскага праходзілі абодва яе браты Эразм і Вернер. І калі Вернера прысудзілі да высылкі на пастаяннае месцажыхарства ва ўнутраныя губерні Расіі, то Эразм быў «цалкам апраўданы, але ваенны суд па невядомай прычыне прызначыў яму часовае пасяленне ў Пермскай губерні». Лёс сыноў так крануў іх бацьку, Фабіяна Горніча, што ён «заўчасна жыццё сваё скончыў» [2, арк. 63]. Невялікую спадчыну, пакінутую ім, захапілі прэтэндэнты па спрэчных прэтэнзіях. Сёстры ж, не маючы даверанасці ад братоў, былі пазбаўлены магчымасці змагацца за вяртанне сваёй маёмасці. Будзіская «маліла праявіць міласэрнасць да сірот, вымушаных цярпець незвычайную галечу» [2, арк. 63 адв.].

Ф. Я. Міркавіч запатрабаваў выпіску па справе Э. Горніча, у якой напісана: «Наогул па справе не відаць якіх-небудзь яго дзеянняў, і ваенна-судная камісія не мела падстаў для абвінавачвання яго ў тым, што быў прыцягнуты да справы ... 13 сакавіка быў прылічаны да 5-га разраду вінаватых і вызвалены ад суда і следства. Разам з тым, як чалавек, на якога ўпала падазрэнне ў нядобранадзейнасці, выдалены быў на час з тутэйшага краю да моманту атрымання звестак пра яго добранадзейнасць» [2, арк. 66 адв.]. Трэба адзначыць, што выпіска была падрыхтавана ў ваенным міністэрстве толькі 10 жніўня 1842 г.

Пакуль ішла перапіска паміж ведамствамі, імператару некалькі разоў падавалі спісы аб паляпшэнні становішча сасланым выхадцам заходніх губерняў, у якія Э. Горніч не трапіў. У выніку склалася парадаксальная сітуацыя, калі людзі, значна больш за яго вінаватыя, хутчэй атрымалі свабоду.

Першым на гэта звярнуў увагу шэф жандараў. 21 студзеня 1843 г. А. Х. Бенкендорф звярнуўся з лістом да Ф. Я. Міркавіча. Ён адзначаў, што калі займаўся гадавой справаздачай, то перагледзеў справы аб палітычных злачынцах і сустрэў па Мінскай губерні «неадпаведнасць у тым, што некаторыя з ліку згаданых злачынцаў, прылічаныя па меры іх злачынства да самага нізкага разраду, не атрымалі яшчэ паляпшэння становішча, тады як іншыя — больш вінаватыя — атрымалі поўнае дараванне. Напрыклад: шляхціцы Людвіг Корсак, Іосіф Кужанецкі і Ян Рудзіеўскі, прысуджаныя да *сталага* высялення з краю, атрымалі дазвол вярнуцца на радзіму, а Эразм Горніч і Аляксандр Мацкевіч, якіх прысудзілі да *часовай* высылкі з краю, да гэтага часу знаходзяцца першы ў Пярмі, а апошні — у Волагдзе» [2, арк. 211—212]. З гэтай нагоды Бенкендорф пацікавіўся меркаваннем Міркавіча пра справе Э. Горніча. Відаць, іх меркаванні супалі. Ссыльны трапіў у чарговы спіс аб памілаванні, які быў пададзены імператару. Э. Горніч вярнуўся на радзіму ў красавіку 1843 г. [2, арк. 286]. Такім чынам, справядлівасць была адноўлена. Што датычыцца Вернера Горніча, то яго лёс аказаўся, мабыць, найбольш сумным. У ходзе следства ён праявіў «вялікую ўпартасць у прызнанні», нягледзячы на тое, што супраць яго сведчылі Ф. Цярлецкі, А. Ажэшка і сам Ш. Канарскі [9, арк. 32 адв.—34]. У той час як брата Эразма адпраўлялі ў Пермскую губерню, Вернер «кідаўся ў гарачцы», і яго пакінулі ў Вільні [6, арк. 39]. Можна толькі выказаць здагадку, што пад уплывам турэмнага зняволення і цяжкай хваробы змяніўся яго псіхічны стан. Ранейшая ўпартасць змянілася прызнаннем не толькі сваёй «злачыннай дзейнасці», але і актыўным супрацоўніцтвам са следствам. В. Горніч сам прасіў следчых «падсяляць» яго ў камеры студэнтаў Дэрпцкага ўніверсітэта. Выведваў сакрэты аднаго студэнта і пераходзіў да іншага. Вязень нават агаварыў у падрыхтоўцы ўзброенага нападу на канвой Е. Брынка свайго лекара Эйзембляцера, а пазней пані А. Снядзецкую за «моцную непрыхільнасць да спадара ваеннага губернатара» [6, арк. 39—41]. Нарэшце, у лютым 1840 г. В. Горніч заявіў, што ведае нейкую важную тайну, якую можа абвясціць толькі імператару. Нягледзячы на тое што палкоўнік Юфераў паведаміў Міркавічу аб «недаверлівасці і падазронасці» характару Горніча, вязень усё ж быў адпраўлены ў Санкт-Пецярбург [6, арк. 56 адв. — 59]. Сустрэча з імператарам не адбылася. Арыштант скончыў жыццё самагубствам. Перад смерцю ён прызнаўся, што агаварыў невінаватых [6, арк. 234].

Летам 1838 г. іераманах пінскага францысканскага кляштара Блажэй Адамовіч у Віленскай следчай камісіі прызнаўся, што вясной 1837 г. ус-

тупіў у тайнае таварыства, аднак асабіста з Канарскім знаёмы не быў, грошай на карысць таварыства не даваў і ніякіх дзеянняў дзеля яго не прадпрымаў [9, арк. 34]. У сакавіку 1839 г. Адамовіча перавялі ў Хадаркоўскі кляштар капуцынаў Кіеўскай губерні. Неўзабаве яго адправілі далей, у Тамбоўскую губерню, пад нагляд паліцыі. У 1845 г. Б. Адамовіч хадайнічаў аб вяртанні на радзіму ў сувязі з дрэнным станам здароўя. Тамбоўскі грамадзянскі губернатар падтрымаў хадайніцтва і адзначыў, што ссыльны «паводзіць сябе сціпла, ні ў чым заганным не заўважаны» [5, арк. 61—61адв.]. Аднак імператар дазволу вярнуцца на радзіму не даў.

Найбольш заможны ўдзельнік Пінскага дэмакратычнага таварыства, уладальнік больш за 2,5 тыс. душ прыгонных сялян шляхціц Юзаф Кужанецкі быў прызнаны вінаватым у тым, што прынёс прысягу на вернасць тайнаму таварыству, ахвяраваў на яго патрэбы 70 рублёў срэбрам, захоўваў у сябе малітву на польскай мове, якая не адпавядала «добранадзейнаму ладу думак» [9, арк. 37]. Ён быў прылічаны да 4-га разраду дзяржаўных злачынцаў і ў 1839 г. высланы ў Валагодскую губерню на сталае месцажыхарства. У красавіку 1842 г. шэф жандараў А. Х. Бенкендорф паведаміў Ф. Я. Міркавічу, што Валагодскі грамадзянскі губернатар хадайнічае аб вяртанні Ю. Кужанецкага на радзіму за яго добрую службу ў Валагодскім судзе [1, арк. 211, 212].

15 чэрвеня 1842 г. да дня нараджэння Мікалая I[1] шэф жандараў падаў спіс прозвішчаў 34 асоб, «якія падпалі пад пакаранне па справах розных эмісараў», з мэтай паляпшэння іх становішча [2, арк. 10—14 адв.]. У спісе было прозвішча Ю. Кужанецкага. Імператар дазволіў яму выбраць месца жыхарства ў адной з бліжэйшых да радзімы губерняў [2, арк. 19]. Выбар пакаранага спыніўся на Гродзенскай губерні [2, арк. 74]. У 1843 г. яму было дазволена вярнуцца ва ўласны маёнтак Асаўніца Кобрынскага павета [14, s. 321]. Шляхціц Пінскага павета Людвіг Корсак у ходзе следства прызнаўся, што ўступіў у тайнае таварыства ў 1836 г. у кватэры Ф. Цярлецкага [9, арк. 29 адв.]. Больш ён ні Канарскага, ні Радзевіча не бачыў і ніякіх «дзеянняў па змове не меў» [10, арк. 2 адв.]. Корсак быў прылічаны да 4-га разраду дзяржаўных злачынцаў і прысуджаны да ссылкі ў Пермскую губерню з вызваленнем маёнтка ад секвестра. Увесну 1842 г. ён падаў прашэнне аб вяртанні на радзіму. Пермскі грамадзянскі губернатар пахвальна адазваўся аб яго паводзінах [1, арк. 23—23 адв.]. Л. Корсак таксама трапіў у спіс, які вышэйшыя саноўнікі па-

[1] Дзень нараджэння імператара Мікалая I — 25 чэрвеня па старым стылі.

далі імператару [2, арк. 10—14 адв.]. У чэрвені 1842 г. Мікалай I дазволіў Корсаку вярнуцца на радзіму [2, арк. 19].

На жаль, няма звестак пра лёс сябра Пінскага дэмакратычнага таварыства падольскага шляхціца Юзафа Краскоўскага, які прызнаўся, што ведаў Канарскага як мясцовага шляхціца Лаеўскага. Знаёмства адбылося ў 1836 г. у кватэры І. Радзевіча, дзе ён быў прыняты ў таемную арганізацыю. Болей Канарскага не бачыў, грошай на карысць таварыства не даваў і ніякіх дзеянняў не прадпрымаў [9, арк. 37 адв.].

Уласна кажучы, Б. Адамовіч, Л. Корсак, Ю. Краскоўскі за два з паловай гады існавання ў Пінскім павеце таемнай арганізацыі ніякіх дзеянняў на яе карысць не рабілі. На погляд аўтара, яны былі ўдзельнікамі «масоўкі», а не героямі п’есы, напісанай Ш. Канарскім. У канцы пратакола допыту Краскоўскі ўласнаручна напісаў: «У апраўданне сваё дадам, што прыцягнуты быў у таварыства пагрозамі Канарскага, які прымусіў мяне выслухаць прысягу, а потым аб’явіў, што калі я адкрыю тайну таварыства, то буду забіты ці атручаны разам з маімі сямейнікамі» [9, арк. 38]. Цяжка сказаць, ці варта давяраць гэтай заяве. З аднаго боку, зразумела жаданне Краскоўскага апраўдацца перад членамі Віленскай камісіі. З другога боку, А. Ажэшка таксама сцвярджаў, што Радзевіч расказваў яму пра існаванне ў Падольскай губерні нейкага асаблівага таварыства, якое павінна было знішчаць «агнём адступнікаў ад правіл змоўшчыкаў» [9, арк. 2 адв.].

Ю. Краскоўскі быў аднесены да 3-га разраду дзяржаўных злачынцаў і прысуджаны да ссылкі ў Сібір з пазбаўленнем правоў шляхецкага стану. Аднак імператар зацвердзіў больш мяккі прысуд: ссылка ў Валагодскую губерню без пазбаўлення правоў і вызваленне маёнтка ад секвестра [10, арк. 3]. У матэрыялах разгледжаных спраў няма аніводнага сведчання аб тым, каб сам Краскоўскі або яго сваякі падавалі прашэнні аб памілаванні. Магчыма, ён памёр у Валагодскай губерні, пра што ў вышэйшыя інстанцыі не паведамлялася.

Клірык манастыра піяраў Казімір Шалевіч у Пінскае дэмакратычнае таварыства ўступіў у 1836 г., меў даручэнне «ўздзейнічаць» на ўніяцкае духавенства і эканомаў Пінскага павета [8, арк. 361]. У ходзе следства заявіў, што меў даручэнне «распаўсюджваць дэмакратычныя правілы, але дзейнічаў толькі для паляпшэння становішча сялян і ніякіх рэвалюцыйных ідэй не распаўсюджваў», грошай на карысць грамадства не ахвяраваў, новых сяброў не прыцягваў [9, арк. 27, 28]. Шалевіч быў прылічаны да 4-га разраду дзяржаўных злачынцаў і сасланы ў Казань [4, арк. 74]. Аднак калі яго маці, шляхцянка Лідскага павета Алаіза Шалевіч,

у чэрвені 1844 г. накіравала імператару прашэнне аб памілаванні і ўказала ў ім, што сын пражывае ў Табольскай губерні, высветлілася, што ў ваенным міністэрстве пра гэта нічога не ведаюць [4, арк. 73—73 адв.]. Растлумачылі сітуацыю ў Галоўным упраўленні Заходняй Сібіры [1]. Казімір сапраўды быў высланы ў сакавіку 1839 г. у Казань, дзе пражываў да канца года. Да таго часу, пакуль казанскі губернатар не паведаміў у Трэцяе аддзяленне, што падследны «пры ўсёй ўтоенасці яго характару выявіў у размовах нядобрыя думкі супраць ўрада» [4, арк. 152 адв.]. У выніку 24 снежня 1839 г. Шалевіча выслалі ў г. Тара Табольскай губерні. Перапіска дзяржаўных установ з нагоды прашэння А. Шалевіч ішла больш за год. Нарэшце, 17 мая 1845 г. Мікалай I дазволіў перавесці К. Шалевіча ў адну з унутраных губерняў Расіі па вызначэнні міністра ўнутраных спраў [4, арк. 291]. Такой губерняй стала Уладзімірская, дзе Казімір паступіў на службу ў канцылярыю губернатара. У 1847 г. ён упершыню атрымаў чатырохмесячны адпачынак на радзіму [5, арк. 145]. У ліпені 1853 г. вярнуўся на радзіму, дзе пражываў пад наглядам паліцыі ў сваякоў у Лідскім павеце [14, s. 589].

Такім чынам, да канца 40-х гг. XIX ст. з дзевяці членаў Пінскага дэмакратычнага таварыства на радзіму вярнуліся Л. Корсак (1842 г.) і Э. Горніч (1843 г.). Ю. Кужанецкі атрымаў права жыхарства ў бліжэйшай да роднай Мінскай Гродзенскай губерні (1842 г.). Двое былых членаў тайнага таварыства знаходзіліся ў ссылцы ва ўнутраных губернях Расійскай імперыі: Б. Адамовіч — у Тамбоўскай губерні, К. Шалевіч — ва Уладзімірскай. У Сібіры ў Томскай губерні па-ранейшаму заставаліся А. Ажэшка і Ф. Цярлецкі, хаця становішча абодвух змянілася ў лепшы бок. Ажэшка атрымаў магчымасць самастойна выбіраць месца жыхарства, Цярлецкі паступіў на грамадзянскую службу. Яшчэ двух удзельнікаў тайнага таварыства ў Пінскім павеце, хутчэй за ўсё, на той час не было ў жывых. В. Горніч скончыў жыццё самагубствам. Пра лёс Ю. Краскоўскага нічога невядома.

У Расійскай імперыі прашэнні аб памілаванні палітычных злачынцаў праходзілі доўгі шлях па кабінетах вышэйшых чыноўнікаў. Канчаткова лёс кожнага з членаў Пінскага дэмакратычнага таварыства вырашаўся ў Санкт-Пецярбургу. На прыкладзе лёсаў членаў таемнага таварыства ў Пінскім павеце можна вызначыць наступныя прычыны аб'ек-

[1] Галоўнае ўпраўленне Заходняй Сібіры альбо Заходне-Сібірскае генерал-губернатарства было заснавана ў 1822 г. па ініцыятыве М. М. Сперанскага, з 1839 г. размяшчалася ў Омску. У 1836—1850 гг. генерал-губернатарам быў князь П. Д. Гарчакоў.

тыўнага характару, якія ўплывалі на вынікі працэсу прыняцця рашэнняў па хадайніцтвах іх саміх і іх родных: актыўнае супрацоўніцтва арыштаваных (або адсутнасць такога) са следствам; змест характарыстык службовых асоб (губернатараў) аб паводзінах і ладзе думак ссыльных; меркаванне губернатараў тых месцаў, куды ссыльныя павінны былі вярнуцца ў выпадку станоўчага вырашэння іх спраў. Мелася на ўвазе гатоўнасць высокапастаўленых чыноўнікаў (або адсутнасць такой) узяць на сябе адказнасць за паводзіны новых падапечных.

Звяртаючыся да пытання аб тым, у якой ступені пакаранне палітычных злачынцаў адпавядала ступені іх віны, трэба адзначыць, што расійская ўлада ў асобе самога імператара, безумоўна, імкнулася да справядлівасці. Нагадаем, што стварэнне Трэцяга аддзялення звязана з даволі праўдападобнай легендай, якую па-рознаму пераказваюць мемуарысты і даследчыкі. Сутнасць яе ў тым, што калі А. Х. Бенкендорф даведаўся аб сваім новым прызначэнні, ён папрасіў у Мікалая І дакладных інструкцый. Замест іх імператар працягнуў яму белую насоўку, якой прапанаваў выціраць слёзы несправядліва пакрыўджаных.

Тэма справядлівасці прагучала і ў той рэальнай інструкцыі, якую Бенкендорф падрыхтаваў для першых штаб-афіцэраў Корпуса жандараў: «Зацвердзіць дабрабыт і спакой усіх у Расіі саслоўяў, глядзець, як яны ахоўваюцца законамі, аднаўляць ва ўсіх мясцовасцях і ўрадавых установах дасканалае правасуддзе» [11, с. 155]. Разам з тым вядомыя факты, якія тычацца ўдзельнікаў «Садружнасці польскага народа», сведчаць, што, нягледзячы на ўсе намаганні шэфа жандараў, казаць пра «дасканалае правасуддзе» не прыходзіцца. У прыватнасці, Л. Корсак, вінаваты толькі ў фармальнай прыналежнасці да Пінскага таемнага таварыства, вярнуўся на радзіму на паўгода пазней удзельніка паўстання 1830—1831 гг. Я. Рудзіеўскага (сябра тайнага таварыства «на арыстакратычных пачатках» эмісара Д. Булеўскага, які вярнуўся ў студзені 1842 г. у Мазырскі павет) [1, арк. 159]. Сам Л. Корсак, як было адзначана вышэй, вярнуўся амаль на год раней значна менш вінаватага (або невінаватага?) Э. Горніча. Прыклады падобнага кшталту можна працягваць.

На погляд аўтара, асноўная прычына падобных, па словах А. Х. Бенкендорфа, «неадпаведнасцей» заключаецца ў тым, што лёсы членаў тайных таварыстваў знаходзіліся ў руках аднаго чалавека. У справах аб палітычных злачынствах апошняе слова заўсёды заставалася за імператарам. Думка абсалютнага манарха перавешвала ўсе астатнія заканадаўчыя механізмы прыняцця рашэнняў. Меркаванне ж апошняга залежала ад цэлага шэрагу суб’ектыўных фактараў: формы і часу падачы матэрыялу,

зместу папярэдніх спраў, настрою манарха і т. п. Інакш кажучы, у любым геаграфічным і храналагічным адрэзку прасторы і часу развагі аб справядлівасці маюць беспадстаўны характар, калі гаворка ідзе пра дзяржаву, у якой лёс асобы вызначае не закон, а воля аднаго чалавека.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў у Вільні (далей — ЛДГА). Ф. 378, палітычны аддзел (далей — п/а). Воп. 216. Спр. 154 — Справа аб асобах, высланых з тутэйшага краю на пасяленне ў розныя губерні. Частка першая на 253 арк.

2. ЛДГА. Ф. 378, п/а. Воп. 216. Спр. 155 — Справа аб асобах, высланых з тутэйшага краю на пасяленне ў розныя губерні. Частка другая на 297 арк.

3. ЛДГА. Ф. 378, п/а. Воп. 216. Спр. 156 — Справа аб асобах, высланых з тутэйшага краю на пасяленне ў розныя губерні. Частка трэцяя на 330 арк.

4. ЛДГА. Ф. 378, п/а. Воп. 216. Спр. 157 — Справа аб асобах, высланых з тутэйшага краю на пасяленне ў розныя губерні. Частка чацвёртая на 358 арк.

5. ЛДГА. Ф. 378, п/а. Воп. 216. Спр. 158 — Справа аб асобах, высланых з тутэйшага краю на пасяленне ў розныя губерні. Частка пятая на 375 арк.

6. ЛДГА. Ф. 378, п/а. 1839. Спр. 145 — Справа па заяўленні арыштанта Вернера Горніча аб зламыснай размове з ім злачынца Яна Яленскага, а таксама пра існаванне ў Дэрпце тайнага дэмакратычнага таварыства паміж студэнтамі на 257 арк.

7. ЛДГА. Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 2 — Следчыя пратаколы па справах Я. Былеўскага, А. Гайковіча, Я. Яленскага, С. Казакевіча, Э. Любавіцкага, Л. Орды, А. Піпера, К. Рапчынскага, Я. Высоцкага. Справа Ф. Александровіч. Перапіска аб розных асобах, якія знаходзяцца пад следствам, на 408 арк.

8. ЛДГА. Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 3 — Следчыя справы Адамовіча, Будзінскага, Чуліцкага, Дмахоўскага, Горніча, Ярмаловіча, Канарскага, Корсака, Краскоўскага, Кужанецкага, Ажэшкі, Рабцэвіча, Радзевіча, Савіча, Сядлінскага, Шалевіча, Цярлецкага, Вішнеўскага, на 374 арк.

9. ЛДГА. Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 17 — Следчыя справы членаў Пінскага тайнага дэмакратычнага таварыства: Б. Адамовіча, К. Будзінскага, Я. Дмахоўскага, Э. Горніча, В. Горніча, Ю. Краскоўскага, Ю. Куржанецкага, А. Ажэшкі, Л. Сядлікоўскага, К. Шалевіча, Ф. Цярлецкага — на 41 арк.

10. ЛДГА. Ф. 1269. Воп. 1. Спр. 24 — Спіс асоб, асуджаных па справе Ш. Канарскага і іншых палітвязняў, якія абвінавачваюцца ў прыналежнасці да тайных таварыстваў, на 46 арк.

11. *Бибиков Г. Н.* А. Х. Бенкендорф и политика императора Николая I. М. : Три квадрата, 2009. 424 с.

12. *Луговцова С. Л.* «Заговор Конарского»: Пинское демократическое общество // Российские и славянские исследования : науч. сб. ; редкол. : А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. Минск : БГУ, 2012. Вып. 7. С. 190—198.

13. Kronika Syberyjska / Wspomnienia Narodowe przez eu ... go Helleniusza. Paryz, 1861. S. 365—407.

14. *Śliwowska W.* Zesłańcy polscy w Imperium Roszjskim w pierwsyej połowie XIX wieku. Slownik biograficzny. Warsawa : Wydawnictwo DIG, 1998. 835 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 20 чэрвеня 2013 г.